ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 28 (785) ● Чацвер, 15 кастрычніка 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

ПА УНІВЕРСІТЭТУ

● На партыйным сходзе фізічнага факультэта з дакладам «Задачы партыйнай арганізацыі факультэта па дастойнай сустрэчы XXIV з'езда КПСС і 50-годдзя універсітэта» выступіў дэкан факультэта І. П. Зяцькоў.

● У аўторан адбылася першая справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў фізічнага факультэта. Аб дзейнасці прафбюро далажыў яго старшыня дацэнт кафедры ядзернай фізікі Ю. Я. Селянінаў. Удзельнікі канферэнцыі падвялі вынікі работы прафсаюзнай арганізацыі. Выбраны дэлегаты на прафсаюзную канферэнцыю універсітэта.

● Камуністы журфака на сваім сходзе абмеркавалі вынікі работы ліпеньскага Пленума ЦК КПСС і задачы партыйнай арганізацыі.

● Учора адбыўся справаздачна-выбарны прафсаюзны сход адміністрацыйна-гаспадарчай часткі універсітэта. На сходзе ішла дзелавая размова аб рабоце прафбюро, аб дастойнай сустрэчы XXIV з'езда КПСС і 50-годдзя універсітэта.

ПЕРШЫ СЕМІНАР

Здаецца, толькі учора ты з трапяткім хваляваннем адказваў на пытанні аўтарытэтных членаў прыёмнай камісіі, а пасля з замiраннем прабягаў вачыма па спісах залічаных. І, знайшоўшы сярод іх сваё прозвішча, лічыў сябе самым шчаслівым.

Сёння ты першакурснік. Раўнапраўны член мнагалюднай студэнцкай сям'і. Каб апраўдаць прадастауленыя табе магчымасці і давер'е з першых жа дзён, трэба сур'ёзна брацца за падручнікі, як мага больш часу праводзіць у чытальных залах бібліятэк.

Пасля сельскагаспадарчых работ старшакурснікі даволі лёгка увайшлі у звычайны рытм студэнцкага жыцця. А першакурсніку зрабіць гэты пераход больш складана. Даводзіцца траціць шмат энергіі і часу, каб вырашыць тое ці іншае, на першы погляд простае, пытанне, знайсці патрэбную кнігу, як след падрыхтавацца да першых практычных або семінарскіх заняткаў.

Аднак давайце лепш завітаем у адну з аудыторый, дзе займаюцца першакурснікі. У пятай групе другога патока хімфака якраз пачаўся першы семінар па гісторыі КПСС. Вядзе яго дацэнт Рыгор Сцяпанавіч Маханёк. Раней, на адной з першых лекцый, выкладчык расказаў першакурснікам аб тым, як праводзяцца семінары, як да іх рыхтавацца.

— Нашы сённяшнія заняткі прысвечаны «Маніфесту Камуністычнай партыі» Маркса і Энгельса. Хто жадае расказаць пра гістарычныя умовы узнікнення марксізма?

Першай падымае руку Тамара Зуйкевіч. Яна гаворыць аб пачатку рабочага руху, аб узнікненні пралетарыяту. Не зусім упэўнена гучыць голас Тамары. Адказу не хапае лагічнай паслядоўнасці. Адчуваецца, што дзяўчына рыхтавалася старанна, але ёй перашкаджае нейкая скаванасць.

Т. Зуйкевіч не удаецца поўнасцю раскрыць пытанне. На дапамогу ёй прыходзіць Наташа Кудзелка. Яна дае ацэнку папярэдняму выступленню, некалькі дапаўняе яго.

Выступленне Наташы Катлабай гучыць больш упэўнена, але, захапіўшыся аналізам класавай барацьбы, яна адхіляецца ад тэмы. Дапамагае ёй Рыгор Сцяпанавіч. Своечасовыя і умела пастауленыя пытанні накіроўваюць размову у патрэбнае рэчышча.

Відавочна, што першакурснікам не лёгка пераадолець школьныя звычкі, адысці ад падручнікаў, навучыцца выказваць думкі не завучанымі фразамі, а уласнымі словамі.

Але, нягледзячы на гэтыя недахопы, семінар праходзіць жыва, цікава. Выступаюць Галя Балоцька, Тамара Тукай, Лена Голуб і іншыя.

Нарэшце разгледжаны усе пытанні тэмы. Р. С. Маханёк дэталёва разбірае выступленне кожнай студэнткі, выказвае заўвагі.

— Увогуле ўражанне аб семінары добрае, — гаворыць ён. — Хацелася б толькі, каб наступныя заняткі праходзілі у форме дыскусіі. Пакуль што перашкаджае гэтаму залішняя скаванасць, нерашучасць студэнтаў. Трэба, каб кожны прымаў гарачы удзел у размове, спрачаўся, выказваў уласную думку па кожнаму пытанню.

З цягам часу, безумоўна, гэта з'явіцца, бо семінар паказаў, што першакурснікі актыўна уключыліся у работу.

А. СВЯТЛОВА.

ДЫСЕРТАЦЫЙНЫ ЎРАДЖАЙ

Калі нараджаецца вучоны? У школьным класе ці у студэнцкай аўдыторыі, на семінары, у гуртку? А можа у лабараторыі у час хімічных эксперыментаў або фізічных доследаў сеецца тое зерне, што кліча у навуку. Гэта яно не дае спакою, прымушае днямі напралёт праседжваць у чытальных залах, карпатліва дакопвацца да ісціны нават у час, адведзены для адпачынку. І глядзіш — нядаўні студэнт ужо аспірант, а выпускнік аспірантуры паспяхова абараняе дысертацыю.

Амаль кожны тыдзень у зале пасяджэнняў вучоных саветаў універсітэта прымаюць кандыдацкае ці доктарскае пасвячэнне тыя, хто унёс свой уклад у навуку.

Мы папрасілі сакратароў саветаў Н. П. Якушаву і М. А. Урынёву назваць прадстаўнікоў універсітэцкага калектыву, якія абаранілі дысертацыі у апошнія некалькі месяцаў. Ніна Панцеляймонауна выкладвае на стол унушальны стос папак — асабістыя справы дысертантаў, якія працуюць у галіне хіміі, фізікі, матэматыкі і абаранілі свае работы у маі, чэрвені, верасні.

Адкрываем адну з папак, чытаем: Вольга Раманауна Скараход. Выдатна закончыла універсітэт у 1939 годзе, працавала на кафедры аналітычнай хіміі. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны знаходзілася у радах партызанскага атрада імя Катоўскага. А у мірны час яе справа — зноў хімія. У 1953 годзе Вольга Раманауна абараняе дысертацыю на ступень кандыдата хімічных навук і у той жа час вядзе вялікую педагагічную і грамадскую работу, працягвае паспяховыя навуковыя даследаванні. Пяру В. Р. Скараход належыць звыш 60 навуковых прац. Пад кіраўніцтвам гэтага высококваліфікаванага спецыяліста выканана і абаронена пяць кандыдацкіх работ. Яе доктарская дысертацыя «Даследаванне сорбцыі слабых арганічных электралітаў на іёнаабменных смолах» — вялікі і каштоўны навуковы ўклад.

Матэрыялы наступнай папкі расказваюць пра галоўнага інжынера праблемнай лабараторыі пауправадніковай тэхнікі Кіма Мікалаевіча Бакіноўскага. Ён вядзе цікавыя даследаванні у галіне пауправадніковай радыёэлектронікі, якія паслужылі асновай для стварэння новых сістэм і прыбораў. Як адзначаюць рэцэнзенты, навуковыя даследаванні К. М. Бакіноўскага вызначаюцца арыгінальнасцю і прастатой вырашэння. Ступень кандыдата тэхнічных навук яму прысуджана аднагалосна.

У гэты час абаранілі кандыдацкія дысертацыі, прысвечаныя новым або малавывучаным праблемам, малодшы навуковы супрацоўнік кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі У. І. Міроненка, выкладчык кафедры атамнай і малекулярнай фізікі А. В. Мінкевіч, выкладчык кафедры матэматычнага аналізу І. А. Сакалоу, асістэнт кафедры фізікі Е. А. Турэцкая, асістэнт кафедры неарганічнай хіміі Г. І. Тарайкоуская, асістэнт кафедры арганічнай хіміі П. М. Малашка.

Напружана працавалі і саветы па гуманітарных і біёлага-геаграфічных навуках. Тут абаранілі доктарскія дысертацыі дэкан геафака М. Т. Раманоўскі («Развіццё мануфактурнай прамысловасці у Беларусі»), загадчык кафедры навуковага камунізма М. Р. Круцько («Месца і роля сучасных дэмакратычных рухаў у барацьбе за пераход да сацыялізма развітых капіталістычных краін»), намеснік дэкана геафака В. А. Жучкевіч («Агульныя рэгіянальныя геаграфічныя заканамернасці тапанімікі»), дацэнт юрфака В. Ф. Чыгір («Жыллёвыя праваадносіны»). Завяршылі свае кандыдацкія даследаванні і паспяхова абаранілі іх выкладчыкі геафака В. Р. Сінякова, В. С. Аношка, Л. А. Паўловіч, Н. І. Жураўская, юрфака — В. П. Дуюн, журфака — І. І. Сачанка, філфака — М. П. Дубаграева, выкладчык кафедры палітэканоміі А. Е. Глебау.

Як бачым, дысертацыйны ўраджай вельмі каштоўны. Вучоныя універсітэта з гонарам апраўдваюць званне правафланговых беларускай навукі.

А. АЛЕНІЧ.

ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ

І ТУТ ЁСЦЬ МЕРА



Ідуць практычныя заняткі па геалогіі і карысных выкапнях СССР у студэнтаў трэцяга курса геафака. Вядзе іх дацэнт кафедры геалогіі Вера Васільеўна **Шчыглова**.

Фота **Д. Чаховіча.**

Не адзін раз я чуў сярод сваіх калег, студэнтаў (ды і чаго грахі таіць, сам так гаварыў): «Студэнт павінен адчуваць заусёды, у першую чаргу, што ён — студэнт, а потым ужо — староста, камсорг, прафорг, старшыня спортбюро»...

Кожны разумеў сэнс гэтых слоў па-свойму. Адны мелі на ўвазе адносіны між сябрамі, таварышамі, сакурснікамі. Другім здавалася, што размова ідзе аб вучобе. «Трэба ведаць не толькі свае правы, але і выконваць абавязкі»... Вучыцца, значыць. Вядомая рэч: вучоба — галоўны абавязак студэнтаў. Гэта і галоўная работа актывістаў. Даволі зразумела: які ты актывіст, калі вучышся дрэнна!!

Але статыстыка гаворыць іншае. Студэнты-актывісты — а іх ва універсітэце палова ад усёй колькасці, — як правіла, вучацца толькі на добра і выдатна.

І зноў-такі, як правіла... Як правіла, але ж не усе... Вось аб гэтай катэгорыі студэнтаў, якія не уваходзяць у паняцце «як правіла», мне і хацелася б павесці размову.

Памятаецца, бюро камітэта камсамола універсітэта слухала справаздачу камсамольцаў філфака. Дэталёва разглядалася работа сектараў факультэцкага камітэта, адзначаліся тыя «плюсы» і «мінусы», якія меліся у рабоце кіруючага камсамольскага органа факультэта. Словам, гаварылі пра добрае і дрэннае, указвалі на недахопы, дапамагалі вызваліцца ад іх. І што высветлілася! Аказваецца, на філфаку кясвоечасова правялі падпіску на газеты і часопісы. А таму у сярэднім па факультэту на кожнага студэнта прыпадала куды менш, чым па аднаму перыядычнаму выданню. Тут і пачалі вінаваціць адказнага за гэту работу, члена камітэта Уладзіміра Адамушку. Маўляў, так і так, недастаткова праводзіў растлумачальную работу сярод... А якія захады зрабіў у гэтым кірунку факультэцкі камітэт? Выходзіла, што агітавацъ за гэтае мерапрыемства трэба было... саміх жа членаў камітэта. На кожным курсе іх па два-тры, а то і болей.

— У сваёй групе я правёў падпіску, — растлумачваў Уладзімір. Хутчэй, можна сказаць, апраўдваўся. І такое даводзіцца рабіць.

Як старараста групы ён асабіста узяўся за справу, магчыма, і не яго. Звычайна падпіску вядуць групкамсоргі. «Але ж ён павінен быў кантраляваць іх работу»,—скажаце вы. Так. Сапрауды так. А ці быў у Адамушкі на гэта час — ніхто, акрамя яго, адказаць не змог бы. У камсамольскім камітэце ведалі, што ён староста групы. І калі выбралі у склад кіруючага органа, Уладзімір на пытанне, ці справіцца, пачуў:

—Нічога. Хлопец дужы. Плечы шырокія. Мяркуем, што справішся...

І Уладзімір Адамушка вучыўся, працаваў, старауся па-камсамольску выконваць грамадскія даручэнні. Але з таго ж семестра пачаліся заняткі на ваеннай кафедры.

— Каго камандзірам вучэбнага узвода назначым!— пытае выкладчык.

— Адамушку! Адамушку!.. — амаль хорам адказваюць сябры-сакурснікі. — Староста ён у нас. Здольны да кіраўніцтва. Будзе кіраваць.

Так стаў Валодзя камандзірам. Пасада гэта не з лёгкіх. Служба — не дружба: дысцыпліна і яшчэ раз дысцыпліна.

Рашылі неяк на філфаку назначыць старастаў курсаў і аддзяленняў. Адну з такіх пасад «пашанцавала» атрымаць Адамушку. Кажуць, што «па сумяшчальніцтву». Так на усіх курсах.

(Працяг на 2-й стар.).

РАСКАЗВАЕ ПРАФЕСАР...

На ўсіх кафедрах біялагічнага факультэта працуюць студэнцкія навуковыя гурткі, удзельнікі якіх рэгулярна займаюцца па важнейшых праблемах біялагічнай навукі. Вялікую папулярнасць заваяваў гурток кафедры заалогіі пазваночных. Студэнты тут вырашаюць цікавыя пытанні па шырокай праграме. На заняткі часта прыходзяць удзельнікі іншых гуртком.

На днях адбылося чарговае пасяджэнне гуртка заолагаў. На гэты раз гасцей было асабліва многа. Прыйшлі навуковыя работнікі і студэнты з кафедр сістэматыкі раслін, заалогіі беспазваночных.

Гэта быў сапраўдны студэнцкі сімпозіум, нават калі меркаваць толькі па мноству вырашаных пытанняў.

Пасяджэнне адкрыў загадчык кафедры прафесар І. К. Лапацін. Ён зрабіў захапляючы даклад аб жывёльным і раслінным свеце горнай часткі Сярэдняй Азіі. Асаблівую зацікаўленасць не толькі заолагаў, але і батанікаў выклікаў расказ аб рэдкіх жывёлінах, якія насяляюць гэты надзвычай прыгожы край.

На працягу 17 гадоў рэдкія жывёлікі і расліны Сярэдняй Азіі былі прадметам вывучэння для прафесара Лапаціна. Вось чаму ён мог паведаміць так многа цікавага, і удзельнікі пасяджэння слухалі яго з глыбокай увагай. Яны горача падтрымалі прапанову выкладчыка арганізаваць студэнцкую экспедыцыю у тыя маладаследаваныя месцы, аб яніх ішла гаворка.

За час існавання гуртка у яго пасяджэннях удзельнічалі вядомыя вучоныя Беларусі. Навуковы супрацоўнік АН БССР тав. Вязовіч, напрыклад, прысвяціў свой даклад палёту птушак і сучасным праблемам біёнікі. 60 навуковых работнікаў і студэнтаў сабраліся на сумеснае пасяджэнне з гурткоуцамі. Яны заслухалі паведамленне В. Ф. Церахава аб усесаюзным метадычным семінары па пытаннях экалогіі пазваночных жывёл.

Асаблівае месца у праграме заняткаў адводзіцца вывучэнню жыцця і дзейнасці вядомых рускіх і савецкіх вучоных. Так, з вялікай цікавасцю было заслухана паведамленне аб жыцці і дзейнасці В. Н. Шнітнікава.

На пасяджэннях гуртка практыкуюцца справаздачы аб навуковай працы студэнтаў. Так, аб выніках пераддыпломнай практыкі зрабілі справаздачу студэнты 5-га курса. На чарзе—студэнты 4-га курса.

Аб паспяховай дзейнасці гуртка гаворыць і той факт, што многія студэнцкія навуковыя работы на рэспубліканскім аглядзе атрымалі высокую ацэнку. На будучы агляд гурток рыхтуе 6 работ.

Н. НОВІКАВА,
наш кар.

СПРАВАЗДАЧА ЗА ЛЕТА

На днях адбылося першае ў гэтым годзе пасяджэнне навуковага гуртка пры кафедры генетыкі і цыталогіі. Студэнты расказалі аб сваёй летняй практыцы. Характарызуючы яе, кандыдат біялагічных навук А. Ф. Былінскі адзначыў, што практыканты выканалі вялікі аб'ём работы.

Члены гуртка намецілі план работы на першае паўгоддзе.

Г. НАУМЧЫК.

ЗАСТАНУЦЦА Ў ПАМЯЦІ

Дзесяткі замежных студэнтаў кожны год заканчваюць нашу навучальную установу. І дзе б яны пасля ні знаходзіліся, дзе б ні працавалі, у іх памяці надоўга застаюцца Беларусь, Мінск, БДУ. Аб гэтым яскрава сведчаць пісьмы выпускнікоў. Вось і нядаўна прыйшло такое пісьмо на імя дэкана па навучанню замежных грамадзян К. К. Германа. Яго прыслаў з В'етнама учарашні студэнт, а сёння дыпламаваны спецыяліст Кхонг Дзінь Хонг. Шчыра, па-сяброўску ён расказвае аб шчаслівых днях сустрэчы з роднымі і блізкімі, сваёй працы, падзеях на радзіме. «Назаўсёды запомню Мінск, — піша ён, — выкладчыкаў, студэнтаў БДУ і родную Беларусь. Усё надоўга застанецца ў маім сэрцы».

І. ДЗЯШУК.

(Працяг. Пачатак у №№ 12, 18, 26, 27).

Размах работы СНТ даў магчымасць камітэту камсамола узмацніць сувязі з прадпрыемствамі і школамі горада, часцей арганізоўваць там лекцыі і даклады, устанавіць цесныя кантакты з многімі універсітэтамі краіны, асабліва з Вільнюскім і Тартускім, а таксама завязаць перапіску са студэнтамі Карлава універсітэта г. Прагі.

Камсамольская арганізацыя дабілася ажыўлення палітыка-выхаваўчай работы сярод моладзі. Камітэт камсамола рашуча выступіў супраць асобных студэнтаў, якія праяўлялі апалітычнасць, нізкапаклонства перад замежным. З членаў партыі і камсамольскага актыву быў створаны інстытут палітінфарматараў для правядзення штотыднёвых інфармацый у студэнцкіх групах. Узмацніў работу навукова-палітычны лекторый. Часта праводзіліся тэарэтычныя канферэнцыі, дыспуты, вечары сустрэч з заслужанымі людзьмі, культпаходы, суботнікі. У ідэйна-палітычным выхаванні моладзі шырока выкарыстоўваўся насценны друк і універсітэцкая шматтыражная газета, рэгулярны выпуск якой быў наладжаны з 1947 г.

Грамадска-палітычная работа студэнцтва выходзіла далёка за межы універсітэта. Састаўной яе часткай стала ахова грамадскага парадку у горадзе. Па закліку ЦК ЛКСМБ камсамольцы універсітэта стварылі брыгады садзеяння міліцыі і павялі рашучую барацьбу супраць правапарушальнікаў. Да 1960 г. членамі народнай дружыны з'яўляліся больш 1000 камсамольцаў, сярод якіх былі і узнагароджаныя граматамі і каштоўнымі падарункамі Міністэрства унутраных спраў БССР, ЦК ЛКСМБ і Мінскага гарадскога управлення міліцыі.

Камсамольская і прафсаюзная арганізацыі БДУ выступілі надзейнымі памочнікамі гарадскіх арганізацый у правядзенні многіх важнейшых мерапрыемстваў. Ні адна кампанія па выбарах у Саветы не праходзіла без актыўнага ўдзелу універсітэцкага студэнцтва. Вялікую работу правялі юнакі і дзяўчаты БДУ па абследаванню дзяцей, якія знаходзіліся на патранаце. Значная увага удзялялася выкананню закона аб усенавучы, высвятленню становішча палітасветы на прадпрыемствах горада, арганізацыі падпіскі на маладзёжны друк і г. д.

Клопатам універсітэцкай камсамолі стала палітыка-выхаваўчая і культурна-масавая работа на прамысловых прадпрыемствах, у школах і калгасах. Падшэфнымі універсітэта былі аўтазавод, завод імя Мяснікова, фабрыкі імя Тэльмана і «Камунарка», чыгуначны вузел, школы г. Мінска, калгасы Дзяржынскага раёна. Тут нашы студэнты нярэдка выступалі з лекцыямі і дакладамі, праводзілі гутаркі аб важнейшых падзеях унутранага і міжнароднага жыцця краіны, ставілі канцэрты мастацкай самадзейнасці, папаўнялі бібліятэкі сабранымі кнігамі, арганізоўвалі алімпіяды, канферэнцыі чытачоў, вечары, сустрэчы, экскурсіі, спартыўныя спаборніцтвы, дапамагалі афармляць стэнды наглядной агітацыі, ствараць розныя гурткі. Толькі ў 1954 г. на прамысловых прадпрыемствах у пастаянных групах агітатарау і лектарау было занята 120 студэнтаў універсітэта, імі было прачытана і праведзена 800 дакладаў і гутарак.

Адной з задач у рабоце студэнцкіх арганізацый была дапамога вучням і працоўнай моладзі вызначыць іх будучую спецыяльнасць, набыць яе. Гэта было асабліва важна таму, што папаўненне вну, пачынаючы з 1956 г., ішло у асноўным за лік людзей з вытворчасці; у 1958 г. яны складалі 60—80 працэнтаў ад ліку паступаўшых у БДУ. Таму не выпадковым, а традыцыйным ва універсітэце стала правядзенне «Дня школьніка». З гэтай жа мэтай былі створаны падрыхтоучыя курсы, арганізаваныя камсамольцамі у БДУ, а таксама на аутазаводзе, заводзе імя Кірава, камвольным камбінаце, у будаўнічым трэсце № 5 і на іншых прадпрыемствах.

Камітэт камсамола і прафком удзялялі пастаянную увагу развіццю шматлікіх форм працоунага выхавання: самаабслугоўванню у студэнцкіх інтэрнатах, удзелу студэнтаў у сельскагаспадарчых работах, у будаўніцтве асобных аб'ектаў у горадзе, у асваенні цалінных зямель. Кожны камсамолец стаў лічыць сваім доугам адпрацаваць у час летніх канікул не менш 15 дзён на розных аб'ектах. Паспяхова працавалі студэнцкія брыгады на будаўніцтве інтэрнатаў па вуліцах Свярдлова і Дзімітрава. На будаўніцтве галоунага корпуса універсітэта праславілася брыгада,

У ГАРНІЛЕ ЖЫЦЦЯ

якую узначальваў камсамолец Ф. Ананчанка. Яна першай адкрыла рахунак камсамольскай капілкі у гонар 40-годдзя ВЛКСМ.

Па закліку ЦК ВЛКСМ камсамол універсітэта прыняў актыуны удзел ва уборцы ураджаю на цалінных землях. Першыя студэнцкія брыгады БДУ у колькасці 294 чалавек паявіліся на цаліне у 1956 годзе. Яны дапамаглі працаунікам двух саугасау Кустанайскай вобласці сабраць, прасушыць і здаць дзяржаве больш 4,5 мільёна пудоў зерня. На працягу 1956—1958 гадоў на землях Казахстана пабывала каля 1.500 студэнтаў універсітэта. Цаліна была для іх школай жыцця, камуністычнага выхавання і працоунай загартоукі. Камсамольцы Аня Корсак, Аня Палякова, Яня Плашчынская, Ілья Залескі, Браніслаў Загорскі, Генадзь Несцяровіч, Іван Сяргееў, Іван Сарока і многія іншыя былі узнагароджаны медалямі «За асваенне цалінных зямель».

Камсамольская і прафсаюзная арганізацыі не выпускалі з поля зроку і культурна-масавую работу, якая з'яўлялася састаўной часткай камуністычнага выхавання моладзі. Яна развівалася у гуртках мастацкай самадзейнасці і у музычным лекторыі. З мэтай цэнтралізацыі кіравання і павышэння ідэйна-палітычнага зместу універсітэцкай самадзейнасці у 1950 годзе быў створаны мастацкі савет, у які ўвайшлі прадстаўнікі рэктарата, партыйнай і камсамольскай арганізацый.

У 1958 г. пры клубе БДУ працавала 18 агульнаўніверсітэцкіх калектываў. Акрамя таго, кожны факультэт меў свае мастацкія калектывы. Найбольшых поспехаў у тыя гады дабіліся універсітэцкі хор і тэатральны калектыў. На рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці прафсаюзаў у 1955 г. хор заняў першае месца і быў узнагароджаны дыпломам ВЦСПС, а у 1957 г. за ўдзел у VI Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Маскве быў удастоены Граматы Міністэрства культуры СССР. Тэатральны калектыў за 1949—1959 гг. паставіў звыш 100 спектакляў. Сярод іх «На дне» і «Мяшчане» М. Горкага, «Рэвізор» Гогаля, «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Чужы цень» К. Сіманава, «Пад залатым арлом» Я. Галана і іншыя. У 1959 г. ён атрымаў высокую узнагароду—Ганаровую грамату Прэзідыума Вярхоунага Савета БССР.

Вялікае выхаваўчае і пазнавальнае значэнне мелі канцэрты БДУ у Мінску, удзел хору, аркестра народных інструментаў і танцавальнага калектыву ва усесаюзных студэнцкіх святах песні і танца у Тарту (1956 г.) і Рызе (1958 г.), а таксама выступленні больш 100 нашых студэнтаў на VI Сусветным фестывалі у 1957 г.

Рабочыя мінскіх заводаў, калгаснікі Дзяржынскага раёна, маракі Балтыйскага флоту, маладыя масквічы горача палюбілі універсітэцкую самадзейнасць. Выступленні перад працоунымі краіны, падрыхтоука і правядзенне аглядаў мастацкай самадзейнасці і маладзёжных фестываляў садзейнічалі актывізацыі і прыцягненню да грамадскай работы вялікай колькасці студэнтаў, павышалі аутарытэт і дзейснасць работы грамадскіх арганізацый універсітэта.

Неад'емнай часткай грамадскага жыцця універсітэта стала спартыунамасавая работа. Пераломным момантам у яе развіцці трэба лічыць 1953 год, калі былі праведзены першы агляд-конкурс факультэтаў па фізкультурнай рабоце і першая круглагадавая спартакіяда, у якой прынялі удзел 1.107 чалавек. І агляд і спартакіяду падрыхтавалі камітэт камсамола, прафком і кафедра фізічнага выхавання, якія змаглі мабілізаваць фізкультурны актыў універсітэта на выкананне пастановы ЦК КП(б)Б ад 31 студзеня 1952 г. аб далейшым развіцці фізкультуры у рэспубліцы. З той пары круглагадавыя спартакіяды праводзіліся кожны год. Знамянальнай стала VIII спартакіяда у 1959-60 навучальным годзе. Яна прайшла па двух этапах: першы быў этапам масавасці, які прыцягнуў да сістэматычных заняткаў фізкультурай амаль 100 працэнтаў студэнтаў, другі—этапам спаборніцтва паміж зборнымі камандамі факультэтаў па 18 відах спорту.

Дасягнутая масавасць у фізкультурнай рабоце дала магчымасць стварыць моцныя агульнаўніверсітэцкія каманды і паспяхова выступаць на адказных рэспубліканскіх спаборніцтвах. У 1956 г. зборная каманда універсітэта упершыню прыняла удзел ва усесаюзных студэнцкіх спаборніцтвах, у якіх удзельнічала 30 каманд, і заняла 10-е месца. Група студэнтаў БДУ у складзе спартыунай дэлегацыі Беларускай ССР паспяхова выступіла на урачыстым адкрыцці VI Сусветнага фестывалю на Цэнтральным стадыёне імя У. І. Леніна у Лужніках. Па ініцыятыве камітэта камсамола калектыу прыняў шэфства над спартсменамі Дзяржынскага раёна і многіх СШ горада Мінска.

Пад пастаянным кантролем камітэта камсамола і прафкома працавала пярвічная арганізацыя таварыства ДТСААФ, створаная ва універсітэце у сакавіку 1949 г. У яе радах заусёды налічвалася звыш 800 членаў. Рэгулярна праходзілі заняткі у стралковай секцыі, у мотагуртку і аутагуртку. Гурткі падрыхтавалі вялікую групу матацыклістаў і шафёрау-аматарау Работа арганізацыі неаднаразова адзначалася як лепшая раённым і гарадскім камітэтамі ДТСААФ.

Значнымі поспехамі у рабоце адзначыла 40-годдзе ВЛКСМ і 40-годдзе БДУ універсітэцкая грамадскасць. Яе дзейнасць прыняла рознабаковы і масавы характар. Камсамол паказаў сябе дастойным памочнікам партыйнай арганізацыі у рашэнні складаных задач жыцця вышэйшай навучальнай установы. Ленінскія словы, якія прагучалі на III з'ездзе камсамола: «Без работы, без барацьбы кніжнае веданне камунізма з камуністычных брашур і творау зусім нічога не варта, таму што яно прадаужала б стары разрыў паміж тэорыяй і практыкай, той стары разрыў, які складау самую агідную рысу старога буржуазнага грамадства»,—былі для студэнтаў іх пуцяводнай зоркай.

В. СІДАРЦОЎ,
кандыдат гістарычных навук.

АДМЕТНЫ СЛЕД

У аудыторыі другога курса факультэта журналістыкі ажыўлена. Камсамольцы курса, як бы выпрастаўшыся пасля доугай сельскай працы, азірнуліся назад — падвялі вынікі яе.

Першым узяў слова сакратар камсамольскага бюро факультэта Лёня Екель. Ён падрабязна расказаў аб працы, аб цяжкасцях, якія пераадолелі рабяты. Прыходзілася працаваць і у полі, і на таку, і на іншых участках.

Усюды студэнты былі на вышыні. Л. Екель асабліва адзначыў Марыну Багрый-Шахматаву, Віктара Жука і Валерыя Дранчука. Пасля заканчэння сельскагаспадарчых работ праўленне калгаса узнагародзіла Віктара Жука і Марыю Мацейка грашовай прэміяй.

Аб рабоце другой групы расказаў камсорг Мікалай Арлоў. Акрамя ўборкі бульбы, студэнты яшчэ дапамагалі будаваць жывёлагадоучыя фермы.

Дружна працавалі і весела адпачывалі камсамольцы трэцяй групы. Камсорг Ларыса Шыганава расказала на сходзе аб працы, аб выпуску сценгазеты, аб падрыхтоўцы мастацкай самадзейнасці.

У цэлым студэнты другога курса факультэта журналістыкі працоўны семестр закончылі на выдатна.

Рабяты жылі ў вялікай дружбе з калгаснікамі. Ва усіх аддзяленнях яны выступілі з лекцыямі, а ў дзень святкавання юбілею камсамола Беларусі арганізавалі канцэрт. Нічога, што на сцэне не ўсё выглядала прафесіянальна. Калгаснікі цёпла прынялі і правільна ацанілі самадзейных артыстаў.

Намеснік дэкана А. і. Раковіч, які прысутнічаў на камсамольскім сходзе, зачытаў нісьмы праўленняў калгасаў з падзякамі студэнтам.

А пасля намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ Васіль Гурын паведаміў, што ў гонар юбілею ЛКСМБ за актыўную работу ў камсамоле камітэт узнагародзіў грашовай прэміяй групу студэнтаў. Сярод іх і рабяты II курса Леанід Екель, Марына Багрый-Шахматава і Таццяна Чарняўская. Сход апладысментамі сустрэў гэтую вестку.

І. КАШАРОЎСКІ.